ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 903.5(476.2)«17»
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-49-59

Паступіў у рэдакцыю 15.06.2021
Received 15.06.2021

А. А. Кунаш

Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь

РЫМСКА-КАТАЛІЦКІ АБРАЗОК XVIII СТ. З КУРГАННАГА МОГІЛЬНІКА ГЛЫБАЎ РЭЧЫЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Аннотация. Статья посвящена иконографическому и семантическому анализу римско-католической иконки, которая была выявлена во время археологического исследования курганного могильника Глыбов в 1958 г. Иконка имеет овальную форму и сделана из медного сплава в технике литья.

На лицевой стороне иконки изображены орудия страстей Иисуса Христа, а на обратной – рельефное изображение св. Екатерины Генуэзской. Орудия страстей – важный и неотъемлемый атрибут мученичества Иисуса Христа – подробно описаны в четырех канонических Евангелиях (Матфея, Марка, Луки и Иоанна), многочисленных апокрифических текстах, отражены в произведениях иконописи и декоративно-прикладного искусства. Орудия страстей, которые принесли Иисусу Христу физические и духовные страдания, символизируют события, происходившие в Иерусалиме в последние часы его земной жизни, а также после смерти. Общее количество элементов-символов, изображённых на лицевой стороне иконки, – 27.

На обратной стороне иконки имеется рельефное изображение св. Екатерины Генуэзской. Св. Екатерина была причислена к лику блаженных Папой Римским Климентом X 1675 г. Канонизирована Папой Римским Климентом XII в 1737 г.

Анализ иконографических и семантических особенностей позволил датировать иконку XVIII в., а наиболее вероятным местом ее изготовления является Италия.

Ключевые слова: археология, иконка, религия, христианство, римско-католическая конфессия, орудия страстей, курган, погребение, Иисус Христос, св. Екатерина

Для цитирования: Кунаш, А. А. Рымска-каталіцкі абразок XVIII ст. з курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці / А. А. Кунаш // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 1. – С. 49–59. https://doi. org/ 10.29235/2524-2369-2022-67-1-49-59

Aliaksandr A. Kunash

Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus

ROMAN CATHOLIC MEDAL FROM THE 18th CENTURY FROM THE BURIAL MOUND OF GLYBAY IN RECHYTSA DISTRICT GOMEL REGION

Abstract. The article is devoted to the iconographic and semantic analysis of the Roman Catholic medal, which was revealed during the archaeological study of the Glybov burial mound in 1958. The medal has an oval shape and is made of a copper alloy using the casting technique.

The obverse of the medal depicts the instruments of the passions of Jesus Christ, and the reverse depicts a relief image of St. Catherine of Genoa. The instruments of passion are an important and integral attribute of the martyrdom of Jesus Christ, which are described in detail in the four canonical Gospels (Matthew, Mark, Luke and John), numerous apocryphal texts, reflected in the works of medal painting and decorative and applied art. The instruments of passions symbolize the events that took place in Jerusalem in the last hours of the earthly life of Jesus Christ, as well as after death, which brought him physical and spiritual suffering. The total number of symbol elements depicted on the front side of the medal is 27.

On the back of the medal there is a relief image of St. Catherine of Genoa. St. Catherine was canonized by Pope Clement X in 1675 and canonized by Pope Clement XII in 1737.

An analysis of the iconographic and semantic features made it possible to date the medal to the 18th century, and the most likely place of its manufacture is Italy.

Keywords: archeology, medal, religion, Christianity, Roman Catholic confession, instruments of passions, barrow, burial, Jesus Christ, St. Catherine

For citation: Kunash A. A. Roman Catholic medal from the 18th century from the burial mound of Glybay in Rechytsa district Gomel region. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2022, vol. 67, no. 1, pp. 49–59 (in Belarusian). https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-49-59


© Кунаш А. А., 2022

Уводзіны. Сведчаннем прыналежнасці да рымска-каталіцкай веры разам з нацельнымі крыжамі і ружанцамі з'яўляліся разнастайныя па форме і семантыцы рэлігійныя абразкі. Абразкі як элемент духоўнай і матэрыяльнай культуры з'яўляюцца багатай інфармацыйнай крыніцай для вывучэння гісторыі рымска-каталіцкай канфесіі, а таксама іканаграфіі, агіяграфіі, эпіграфікі. Вывучэнне гэтай катэгорыі хрысціянскіх старажытнасцей, выяўленых на тэрыторыі Беларусі, з'яўляецца важным і неад'емным элементам пры даследаванні гісторыі рымска-каталіцкай канфесіі.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы ўжытак, а таксама аналіз семантыкі ўнікальнага для тэрыторыі Беларусі рымска-каталіцкага абразка XVIII ст., які быў выяўлены падчас археалагічных даследаванняў курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў 1958 г.

Асноўная частка. Курганны могільнік размешчаны на паўднёвай ускраіне в. Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці на высокім правым беразе р. Днепр. Археалагічныя даследаванні двух курганных насыпаў ажыццяўляліся ў жніўні–верасні 1958 г. пад кіраўніцтвам С. С. Шырынскага.

Курган № 1 размяшчаўся ў паўночнай частцы могільніка. Даўжыня кургана з поўдня на поўнач складала 7,1 м, з захада на ўсход – 8,8 м, вышыня – 0,60–0,64 м, акружнасць – 25,8 м. Насып быў пакрыты слоем дзірвану і парослы кустарнікам (мал. 1). Курган быў раскапаны на знос з пакіданнем бровак, якія пасля зняцця профілей прыбіраліся [1, с. 1–2].



Мал. 1. План кургана № 1 курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці

Fig. 1. Plan of the mound №1 of the Hlybaŭ mound cemetery of Rechytsa district Gomel region

У верхніх пластах курганнага насыпу была выяўлена яма-перакоп Г-падобнай формы, якая была запоўнена рудым з карычневым адценнем пяском. Памеры ямы: з поўдня на поўнач – 2 м, з захаду на ўсход – 1,96 м, глыбіня – 0,84 м. У запаўненні ямы, на глыбіні 0,36 м, былі выяўлены тры фрагменты керамікі; на глыбіні 0,42 м знойдзены нож XVIII–XIX стст. (датаванне С. С. Шырынскага) з рэшткамі драўлянай дзяржальні. На дне ямы, на глыбіні 0,83 м, у адпаведнасці з азначэннем супрацоўніка аддзела нумізматыкі ДГМ Н. Собалевай, быў выяўлены "бронзовый польский католический образок конца XVIII – первой половины XIX в. с изображением на лицевой стороне св. Екатерины, а на обратной – орудий страстей христовых" [1, с. 1–2; 2, с. 121–122].

На глыбіні 0,9 м ад верха кургана была зафіксавана пахавальная яма прамавугольнай формы, якая была заглыблена ў мацерыковы пясок. На дне ямы (1,84 м ад верха кургана) выяўлена пахаванне згодна з абрадам інгумацыі, якое датуецца XII–XIII стст. і суадносіцца з племенем дрыгавічоў [1, с. 3].

Косткі з пахавання былі перададзены С. С. Шырынскім у Маскоўскі музей антрапалогіі. Рэчавы матэрыял, у тым ліку і рымска-каталіцкі абразок XVIII ст., быў перададзены на гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава (даведка пра перадачу прадметаў далучана да справаздачы) [1, с. 3].

Неабходна адзначыць, што знаходкі рэчаў асабістай набожнасці Новага часу, якія выяўлены ў курганных насыпах XII–XIII стст., з'яўляюцца даволі ўнікальнай з'явай і, на жаль, не маюць абгрунтаваных тлумачэнняў. Для падрыхтоўкі артыкула выкарыстаны фотаздымак, які размешчаны ў палявой справаздачы.

Апісанне абразка. Двухбаковы абразок авальнай формы, выраблены з меднага сплаву ў тэхніцы ліцця.


На ліцавым баку абразка адлюстраваны прылады пакут Хрыста, а на адваротным – выява св. Кацярыны. Іканаграфічная кампазіцыя на двух баках заключана ў рэльефную рамку па перыметры абразка. Вушка абразка страчана, замест яго для падвешвання ў верхняй частцы пад рамкай маецца скразная, неахайна зробленая гарызантальная адтуліна з ірванымі краямі. Памеры абразка С. С. Шырынскім не прыведзены, фотаздымак пададзены без маштабу (мал. 2).

Іканаграфія. На ліцавым баку абразка размешчаны рэльефныя выявы прылад пакут Ісуса Хрыста. Прылады пакут, згодна з афіцыйнымі Евангеллямі ад Матфея, Марка, Лукі, Іаана, а таксама апакрыфічнымі тэкстамі, сімвалізуюць падзеі, якія прынеслі Хрысту фізічныя і духоўныя пакуты і адбываліся ў Іерусаліме ў апошнія дні і гадзіны яго зямнога жыцця, а таксама пасля смерці [3]. Агульная колькасць элементаў-сімвалаў, адлюстраваных на ліцавым баку абразка, складае 27. Інтэрпрэтацыя размешчаных сімвалаў ажыццяўлялася з дапамогай Евангельскіх тэкстаў, твораў іканапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мал. 3).



Мал. 2. Рымска-каталіцкі абразок XVIII ст. з курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці

Fig. 2. Roman Catholic medal of the XVIII century from the mound cemetery of Hlybaŭ of Rechytsa district Gomel region



Мал. 3. Схема размяшчэння прылад пакут Хрыста на рымска-каталіцкім абразку XVIII ст. з курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці

Fig. 3. Scheme of placing the instruments of Christ's suffering on a Roman Catholic medal of the 18th century from the Hlybaŭ burial mound of Rechytsa district Gomel region

Цэнтральнае месца на ліцавым баку абразка займае выява лацінскага чатырохканцовага ***крыжа***, на якім быў раскрыжаваны Ісус Хрыстос і які з'яўляецца галоўным сімвалам хрысціянства. У падножжы крыжа размешчаны схематычны схіл – ***Галгофа***, а па дыяганалі ўздоўж крыжа – выявы ***кап'я*** і ***кія з губкай***.

Галгофа – месца раскрыжавання Ісуса Хрыста ("*І ўзялі Ісуса і павялі; і, несучы крыж Свой, Ён выйшаў на месца, называнае Лобным, што па-яўрэйску называецца Галгофа, дзе Яго распялі і з Ім двух іншых, з аднаго боку і з другога, а пасярэдзіне Ісуса*" [3, с. 231]; «*І прыйшоўшы на месца, якое называецца Галгофа, што азначае "месца чэрапа*"» [3, с. 68]).

З левага боку ад крыжа адлюстравана ***кап'ё***, якім, згодна з Евангеллем ад Іаана, рымскі воін (у апакрыфічным Евангеллі ад Нікадзіма пазначана яго імя – сотнік Лангін [4, с. 58]) працяў мёртвага Хрыста на крыжы ("*але адзін з воінаў кап'ём працяў Яму бок, і адразу выцекла кроў і вада*" [3, с. 232]).

З правага боку ад крыжа адлюстраваны ***кій з губкай***, якую рымскі воін, змачыўшы ў воцаце, паднёс да вуснаў Хрыста ("*І адразу пабег адзін з іх, узяў губку, намачыў у воцат і, насадзіўшы на кій, даваў Яму піць*" [3, с. 69]; "*І воіны, напоўніўшы губку воцатам і насадзіўшы яе на сцябліну ісопу, паднеслі да Яго вуснаў*" [3, с. 232]; "*А адзін пабег, намачыў губку воцатам і, насадзіўшы на кій, даваў Яму піць, кажучы: чакайце, пабачым, ці прыйдзе Ілія зняць Яго"* [3, с. 111]).

Да кап'я і кія з губкай прывязана па ***вяроўцы***, якія звісаюць з абодвух бакоў уздоўж крыжа. Да вяровак прымацаваны па чатыры прылады пакут з кожнага боку. З левага боку размешчаны ***бізун***, ***галінкі пальмы***, ***малаток***, ***абцугі***, з правага боку – ***розгі***, ***латныя пальчаткі***, ***меч з адрэзаным вухам***, ***кашалёк з манетамі***. ***Вяроўка*** з'яўляецца прыладай пакут, якой Хрыста звязвалі падчас бічавання.

Прылады пакут, якія размешчаны на вяроўцы з левага боку: ***бізун –*** трохчасткавы з металічнымі ўстаўкамі, якім бічавалі Хрыста па загадзе рымскага пракуратара Понція Пілата ("*Тады ўзяў Пілат Ісуса і аддаў на бічаванне*" [3, с. 230]); ***галінкі пальмы*** – сімвалізуюць уваходжанне Хрыста ў Іерусалім за некалькі дзён да раскрыжавання ("*На другі дзень мноства людзей, якія прыйшлі на свята, пачуўшы, што Ісус ідзе ў Іерусалім, узялі пальмавыя галіны і выйшлі насустрач Яму, і ўсклікалі: Асанна! Благаславёны Той, Хто прыходзіць у імя Гасподняе, Цар Ізраілеў!*" [3, с. 216]); ***малаток*** – у момант раскрыжавання ім з дапамогай цвікоў прыбівалі Хрыста да крыжа; ***абцугі*** – імі з мёртвага цела Хрыста даставалі цвікі.

Прылады пакут, якія размешчаны на вяроўцы з правага боку: ***розгі*** – імі ажыццяўлялася бічаванне Хрыста па загадзе Понція Пілата; складзеныя накрыж ***латныя пальчаткі*** сімвалізуюць рымскіх воінаў, якія наносілі цялесныя пакаранні Хрысту; ***меч з адрэзаным вухам*** адносіцца да падзеі, зафіксаванай у чатырох Евангеллях і звязанай з арыштам Хрыста (“*Тады Сіман Пётр, маючы меч, выняў яго і ўдарыў першасвятаровага раба і адсек яму правае вуха; імя раба было Малх*” [3, с. 228]; “*І адзін з іх ударыў першасвятаровага раба і адсек яму правае вуха*” [3, с. 176]; “*Адзін жа з тых, што стаялі тут, дастаў меч, ударыў раба першасвятаровага і адсек яму вуха*” [3, с. 107]; “*І вось, адзін з тых, што былі з Ісусам, працягнуўшы руку, дастаў меч свой і, ударыўшы раба першасвятаровага, адсек яму вуха*” [3, с. 65]); ***кашалёк з манетамі*** сімвалізуе плату, якую атрымаў Іуда Іскарыёт ад першасвятароў Сінедрыёна за здраду і выдачу Хрыста (“*Тады адзін з дванаццаці, якога звалі Іуда Іскарыёт, пайшоў да першасвятароў і сказаў: што вы дасце мне, і я вам выдам Яго? Яны прапанавалі яму трыццаць срэбранікаў*” [3, с. 62]; “*Тады Іуда, які выдаў Яго, убачыўшы, што засудзілі Яго, і раскаяўшыся, аддаў трыццаць срэбранікаў першасвятарам і старэйшынам, кажучы: саграшыў я, прадаўшы кроў нявінную. Яны ж сказалі: што нам да таго? глядзі сам. І кінуўшы срэбранікі ў храме, ён адышоў; і пайшоўшы, павесіўся*” [3, с. 66]).

Над крыжом размешчана выява ***голуба*** ў прамяністым арэоле. Голуб сімвалізуе Святы Дух, які спусціўся на Хрыста падчас яго хрышчэння ў рацэ Іардан (“*І сталася: калі хрысціўся ўвесь народ, і Ісус, ахрысціўшыся, маліўся, раскрылася неба, і сышоў на Яго Дух Святы ў цялесным выглядзе, як голуб, і голас быў з неба, які прамовіў: Ты Сын Мой Узлюблены, Цябе Я ўпадабаў*” [3, с. 122–123]; “*І ахрысціўшыся, Ісус выйшаў адразу з вады; – і вось, адкрыліся Яму нябёсы, і ўбачыў Іаан Духа Божага, Які сыходзіў, як голуб, і апускаўся на Яго*” [3, с. 7]; “*І было ў тыя дні, прыйшоў Ісус з Назарэта Галілейскага і хрысціўся ад Іаана ў Іардане. І калі выходзіў з вады, убачыў адразу Іаан, што раскрываюцца нябёсы і Дух як голуб сыходзіць на Яго*” [3, с. 73]; “*І сведчыў Іаан, кажучы: я бачыў Духа, Які сыходзіў як голуб з неба, і Ён застаўся на Ім*” [3, с. 187]).

На вертыкальнай лопасці крыжа, над сяродкрыжжам, размешчана ***таблічка*** (Titulus Crucis) з лацінскім надпісам INRI (Iesus Nazarenus Rex Iudaeorum) (“*І зрабіў надпіс Пілат і змясціў на крыжы. А было напісана: Ісус Назаранін, Цар Іудзейскі. Гэты надпіс чыталі многія з Іудзеяў, таму што блізка ад горада было тое месца, дзе быў распяты Ісус, а напісана было па-яўрэйску, па-грэчаску, па-лацінску*” [3, с. 231–232]).

У сяродкрыжжы размешчаны ***цярновы вянец***, які быў ускладзены рымскімі воінамі на галаву Хрыста падчас катаванняў (“*і воіны, сплёўшы вянец з церняў, усклалі Яму на галаву*” [3, с. 230]; “*і, сплёўшы вянец з цёрну, усклалі на галаву Яму*” [3, с. 68]). У цэнтры цярновага вянца маецца выява ***палаючага сэрца*** Ісуса Хрыста.

Таксама ў сяродкрыжжы (з двух бакоў ад гарызантальнай і вертыкальнай перакладзіны) размешчаны выявы ***далоняў*** (зверху) і ***ступняў*** (знізу) Хрыста. Падчас раскрыжавання далоні і ступні Хрыста былі прабіты цвікамі.

На ніжняй лопасці крыжа размешчаны наступныя элементы: плат св. Веранікі і хітон Хрыста. ***Плат св. Веранікі*** (вэлюм, або хустка св. Веранікі) з выявай ліка Ісуса Хрыста лічыцца першай прыжыццёвай выявай Хрыста. Згодна з рымска-каталіцкай традыцыяй, набожная Вераніка, якая суправаджала Хрыста падчас крыжовага шляху на Галгофу, выцерла яму акрываўлены твар хусткай, на якой і адбіўся яго лік (Нерукатворны вобраз) [5, с. 1941–1942].

У ніжняй частцы абразка, з абодвух бакоў ад вертыкальнай лопасці крыжа, размешчаны наступныя прылады пакут: ***калона бічавання***, ***збан з вадой на падносе***, ***певень***, ***лесвіца***, ***масляная лампа***, ***косці для гульні***.

З левага боку ад вертыкальнай лопасці крыжа размешчаны ***калона бічавання*** – калона, да якой Хрыстос быў прывязаны падчас бічавання; ***збан з вадой на падносе*** – адносіцца да сюжэта, які апісаны ў Евангеллі ад Матфея і звязаны з судом над Ісусам Хрыстом. Падчас суда Понцій Пілат здзейсніў прынятае сярод іўдзеяў рытуальнае абмыванне рук у знак недатычнасці да забойства (“*Пілат, бачачы, што нічога не дапамагае, а неспакой расце, узяў вады і ўмыў рукі перад людзьмі, кажучы: невінаваты я ў крыві Праведніка Гэтага; глядзіце самі*” [3, с. 68]); ***певень*** сімвалізуе адрачэнне апостала Пятра ад Ісуса Хрыста пасля яго арышту і падчас суда, што было

прадказана самім Хрыстом падчас тайнай вячэры. Сюжэт з адрачэннем Хрыста падрабязна апісаны ў чатырох Евангеллях: у Евангеллі ад Матфея (“*Сказаў яму Ісус: праўду кажу табе, што гэтае ночы, перш чым заспявае певень, тройчы адрачэшся ад Мяне*” [3, с. 63]; “*Тады ён пачаў прысягаць і бажыцца: я не ведаю Гэтага Чалавека. І тут жа заспяваў певень*” [3, с. 66]; “*І згадаў Пётр словы, сказаныя яму Ісусам: перш чым заспявае певень, тройчы адрачэшся ад Мяне. І выйшаўшы вонкі, плакаў горка*” [3, с. 66]); у Евангеллі ад Іаана (“*праўду, праўду кажу табе: не прапяе певень, як ты адрачэшся ад Мяне тройчы*” [3, с. 221]; “*Пётр ізноў адрокся; і адразу певень заспяваў*” [3, с. 229]); у Евангеллі ад Лукі (“*А Ён сказаў: кажу табе, Пётр, не прапяе сёння певень, як ты тройчы адрачэшся, сказаўшы, што не ведаеш Мяне*” [3, с. 175]; “*Але Пётр сказаў: чалавека, я не ведаю, што ты гаворыш. І адразу, калі ён яшчэ гаварыў, заспяваў певень*” [3, с. 177]); у Евангеллі ад Марка (“*І кажа яму Ісус: праўду кажу табе, што ты сёння, у гэтую ноч, перш чым двойчы заспявае певень, тройчы адрачэшся ад Мяне*” [3, с. 107]; “*Ён жа адрокся, кажучы: не ведаю і не разумею, што ты гаворыш. І выйшаў адтуль на пярэдні двор; і заспяваў певень*” [3, с. 109]; “*І другі раз заспяваў певень. І ўспомніў Пётр слова, якое сказаў яму Ісус: перш чым певень двойчы заспявае, ты адрачэшся ад Мяне тройчы. І пачаў плакаць*” [3, с. 109]).

З правага боку ад вертыкальнай лопасці крыжа размешчаны ***лесвіца*** – прылада, з дапамогай якой Іосіф Арымафейскі і Нікадзім знялі цела Хрыста з крыжа пасля раскрыжавання; ***масляная лампа –*** сімвал, які адносіцца да здрады Іуды, калі Хрыстос быў арыштаваны рымскімі воінамі ў Гефсіманскім садзе (“*і вось Іуда, узяўшы атрад воінаў і служыцеляў ад першасвятароў і фарысеяў, прыходзіць туды з факеламі, і ліхтарамі, і зброяй*” [3, с. 228]); ***косці для гульні*** ўяўляюць сабой тры кубікі, пакладзеныя адзін на адзін у форме піраміды.

Косці для гульні і ***хітон Хрыста*** сімвалізуюць жэрабя, які быў кінуты паміж рымскімі воінамі, каб падзяліць адзенне Хрыста (“*Воіны ж, калі распялі Ісуса, узялі адзенне Яго і раздзялілі на чатыры часткі, кожнаму воіну частка, і хітон; хітон жа быў не шыты, а суцэльна тканы ад верху; тады сказалі яны адзін аднаму: не будзем разрываць яго, а кінем на яго жэрабя, чый будзе. Так мела споўніцца Пісанне, у якім сказана: “раздзялілі адзенне Маё між сабою і пра вопратку Маю кідалі жэрабя”. Воіны так і зрабілі*” [3, с. 232]; “*Тыя, што ўкрыжавалі Яго, дзялілі адзежу Яго, кідаючы жэрабя*” [3, с. 68]; “*І тыя, што распіналі Яго, дзялілі адзежу Яго, кідаючы жэрабя на яе, каму што ўзяць*” [3, с. 110]; “*І, дзелячы адзежу Яго, кідалі жэрабя*” [3, с. 179]).

Па перыметры абразка размешчаны надпіс на лацінскай мове: “PASSIO CHRISTI CONFORTA ME” (“Пакуты Хрыстовыя, умацуйце мяне!”). Дадзены выраз паходзіць з малітвы “Anima Christi”, якая прысвечана Ісусу Хрысту. Тэкст малітвы вядомы з першай паловы XIV ст. і сустракаецца ў манускрыптах і эпіграфіцы. Аўтарства малітвы да канца не высветлена. З XVII ст. малітва “Anima Christi” атрымала распаўсюджанне ў лютэранскай і праваслаўнай царкве [6, с. 662–663; 7, s. 515].

Мастацкае ўвасабленне прылад пакут Хрыста пачынаецца на тэрыторыі Заходняй Еўропы з эпохі Сярэднявечча і атрымлівае шырокае распаўсюджанне ў Новы час: “Хрыстос з прыладамі пакутаў” (XVIII ст.), ікона захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь [8, № 16]; “The Man of Sorrows in the arms of the Virgin” (1475 г. або 1479 г.), ікона захоўваецца ў Нацыянальнай галерэі Вікторыі (Мельбурн, Аўстралія) [9]; “Mąż Boleści” (XVIII–XIX стст.), ікона захоўваецца ў гістарычным музеі г. Санак (Польшча) [10, s. 43, № 147]; “Chrystus jako Mąż Boleści” (1443 г.), ікона захоўваецца ў Нацыянальным музеі ў Варшаве [11]. Сюжэт Хрыста з прыладамі пакут таксама знайшоў адлюстраванне ў гравюрах, ілюмінаваных манускрыптах, творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

На адваротным баку абразка размешчана рэльефная выява св. Кацярыны Генуэзскай. Профіль святой накіраваны ў левы бок на тры чвэрці. Св. Кацярына апранута ў заможную сукенку з фальбонай, якая адпавядае яе высокаму прыжыццёваму сацыяльнаму статусу. Локцем правай рукі яна абапіраецца на пакрытую тканінай паверхню, а ў руках трымае распяцце. Валасы прыбраны ў акуратную прычоску. Над галавой – німб.

Па перыметры абразка размешчаны надпіс на лацінскай мове: “S[ANCTA] CATHARINA FLISCA ADVRNA IANVEN[SIS]” (“Святая Кацярына Фіескі Адорна Генуэзская”) [12, s. XX].



Мал 4. Св. Кацярына з распяццем у руках з кнігі "Vita Di Santa Caterina Fiesca Adorna Da Genova", 1737 г.

Fig. 4. St. Catherine with the Crucifixion in her hands from the book «Vita Di Santa Caterina Fiesca Adorna Da Genova», 1737 year



Мал 5. Св. Кацярына з распяццем у руках (Davide Campi, 1742 (Museo dei Beni Culturali dei Cappuccini))

Fig. 5. St. Catherine with the Crucifix in her hands (Davide Campi, 1742 (Museo dei Beni Culturali dei Cappuccini))



Мал. 6. Св. Кацярына з распяццем у руках (Carlo Gregori (1702–1759), пасля 1737 г. (Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)))
Fig. 6. St. Catherine with the Crucifix in her hands (Carlo Gregori (1702–1759), after 1737 г. (Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)))



Мал 7. Св. Кацярына з распяццем у руках (Carlo Gregori (1702–1759), пасля 1737 г. (Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)))
Fig. 7. St. Catherine with the Crucifix in her hands (Carlo Gregori (1702–1759), after 1737 г. (Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)))

Гістарычная даведка. Св. Кацярына Генуэзская (Caterina da Genova) (1447 г. – 15.09.1510 г.). Паходзіла з арыстакратычнага і заможнага роду Фіескі. Разам са сваім мужам уваходзіла ў Трэці францысканскі ордэн. 22 сакавіка 1473 г., знаходзячыся ў стане экстазу падчас малітвы, у Кацярыны Генуэзскай было бачанне сыходзячага крывёй Хрыста, што паслужыла прычынай яе звароту да адданай набожнасці, міласэрнасці. Пасля смерці мужа ў 1479 г. працавала ў бальніцы Генуі, дзе займалася доглядам за хворымі, у тым ліку і хорымі на чуму. Прылічана да ліку благаславёных (беатыфікавана) Папам Рымскім Клімантам X у 1675 г. Кананізавана Папам Рымскім Клімантам XII у 1737 г. [13, с. 1799; 14, с. 446–447].

Іканаграфічны вобраз св. Кацярыны з распяццем у руках, аналагічны адлюстраванаму на абразку, склаўся ў другой чвэрці XVIII ст. пасля кананізацыі святой. Ён адлюстраваны ў творах жывапісу [15] і на гравюры (мал. 4–7): "S Catharina de Genua Flisca Adurna Vidua" (Davide Campi, 1742, Museo dei Beni Culturali dei Cappuccini) [16]; "S Catharina Genunsis" (Carlo Gregori (1702–

1759), пасля 1737, Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)) [17]; “Sancta Catharina Januen” (Carlo Gregori (1702–1759), пасля 1737, Die Staatlichen Kunstsammlungen Dresden (Kupferstich-Kabinett)) [18]. Адным з першых адлюстраванняў святой з’яўляецца гравюра св. Кацярыны, апублікаваная ў кнізе “Vita Di Santa Caterina Fiesca Adorna Da Genova”, прысвечанай жыццёваму шляху святой. Яна была надрукавана ў 1737 г. пасля кананізацыі св. Кацярыны [12].

Аналогіі. Апісаны абразок з’яўляецца ўнікальнай знаходкай. Поўныя аналогіі з тэрыторыі Еўропы аўтару не вядомы, нягледзячы на прыкладзеныя намаганні ў вывучэнні спецыялізаванай літаратуры, прысвечанай рэчам асабістай набожнасці рымска-каталіцкага веравызнання XVI–XX стст. У якасці блізкіх па семантыцы і форме экзэмпляраў неабходна прывесці шэраг абразкоў, якія былі выяўлены падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Еўропы, а таксама захоўваюцца ў музейных і прыватных калекцыях. Іканаграфія на выяўленых абразках супадае з сюжэтам экзэмпляра з-пад Глыбава толькі адносна аднаго з бакоў: на іх або размешчана кампазіцыя прылад пакут Хрыста, або адлюстравана выява св. Кацярыны.

Абразкі з аналагічнай выявай прылад пакут Хрыста захоўваюцца ў музейных калекцыях Партугаліі (Biblioteca Nacional: Gabinete de Numismatica, Lisbona [19, s. 130, 135 № 21]), Харватыі (Muzeja grada Zagreba [20, № 11]). Шэраг абразкоў быў набыты або захоўваецца ў прыватных калекцыях на тэрыторыі Іспаніі [21, s. 125, 437; 22; 23, s. 147, fig. 4; 24–27]. Абразкі з выявай прылад пакут Хрыста датуюцца XVIII ст. (пасля 1737 г.).

Абразкі з аналагічнай выявай св. Кацярыны захоўваюцца як у музейных калекцыях Італіі (Museo francescano, Roma [27, s. 342–343, № 567], так і ў прыватных калекцыях на тэрыторыі Італіі [28, s. 90, № 89] і Іспаніі [22, s. 217, 449]. Абразкі з выявай св. Кацярыны датуюцца XVIII ст. (пасля 1737 г.).

Высновы. Аналіз іканаграфіі і семантыкі апісваемага абразка дазваляе зрабіць наступныя высновы.

Рымска-каталіцкі абразок з курганнага могільніка Глыбаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці быў выраблены ў XVIII ст. (пасля 1737 г.), на што ўказвае шэраг фактараў:

1) іканаграфія і семантыка абразка;

2) знаходкі аналагічных артэфактаў, якія датуюцца XVIII ст. і былі выяўлены на тэрыторыі Італіі, Іспаніі, Харватыі, Партугаліі;

3) археалагічны кантэкст (у яме-перакопе выяўлены некалькі кавалкаў керамікі Новага часу і нож XVIII–XIX стст.);

4) абразок выраблены ў тэхніцы ліцця, якая была ўласціва ў тым ліку і абразкам XVII–XVIII стст.;

5) вобраз св. Кацярыны, які размешчаны на адваротным баку абразка, склаўся пасля яе кананізацыі (1737 г.) і быў адлюстраваны ў творах графікі, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Прылады пакут з’яўляюцца важным і неад’емным інструментальным атрыбутам пакутніцкай смерці Ісуса Хрыста. Яны падрабязна апісаны ў чатырох кананічных Евангеллях, шматлікіх апакрыфічных тэкстах, а таксама знайшлі адлюстраванне ў творах іканапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Комплекс пісьмовых і выяўленчых крыніц дазволіў дакладна інтэрпрэтаваць прылады пакут Хрыста, якія размяшчаюцца на апісваемым абразку.

Можна меркаваць, што разглядаемы абразок быў выраблены на тэрыторыі Італіі. На гэта ў першую чаргу ўказваюць выява св. Кацярыны, культ якой склаўся на тэрыторыі Італіі (г. Генуя) пасля яе кананізацыі ў 1737 г., а таксама знаходкі аналагічных абразкоў, якія былі выяўлены пераважна на тэрыторыі Заходняй і Паўднёвай Еўропы.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Ширинский, С. С. Отчет о раскопках трех курганов у деревни Глыбов Речицкого района Гомельской области в 1958 г. / С. С. Ширинский // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 153а. – 10 с., 3 ил., 1 справка.

2. Ширинский, С. С. Курганы XI–XII вв. у дер. Глыбов / С. С. Ширинский // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института археологии / Акад. наук СССР. – М., 1965. – Вып. 104 : Средневековые памятники Восточной Европы. – С. 121–123.

3. Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста : [пер. з грэч. мовы на беларус. Бібл. каміс. Беларус. Праваслаўнай Царквы]. – Мінск : Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора : Медыял, 2017. – 543 с.

4. Апокрифические сказания об Иисусе, святом семействе и свидетелях Христовых / сост.: И. С. Свенцицкая, А. П. Скогорев. – М. : Когелет, 1999. – 175 с.

5. Яблоков, К. Вероника / К. Яблоков // Католическая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: Г. Цёрох (председатель) [и др.]. – М., 2002. – Т. 1. – С. 941–942.

6. Сахаров, П. «Anima Christi» / П. Сахаров // Католическая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: В. Л. Задворный (гл. ред.) [и др.]. – М., 2013. – Т. 5. – С. 662–663.

7. Frisbee, S. H. Anima Christi / S. H. Frisbee // The Catholic encyclopedia: an international work of reference on the constitution, doctrine, discipline, and history of the Catholic Church : [in 17 vol.] / Catholic Truth Comm. ; ed. Ch. G. Herbermann. – New York, 1913. – Vol. 1. – P. 515.

8. Іканапісная спадчына Беларусі XVII – пачатку XX ст. [Выяўленчы матэрыял] = Иконописное наследие Беларуси XVII – начала XX в. = Icon-Painting Heritage of Belarus of the 17th – early 20th Centuries : помнікі са збору Нац. гіст. музея Рэсп. Беларусь / [уклад. і прадм. Г. Флікоп-Світы]. – Мінск : Кнігазбор, 2019. – 84 с.

9. Memling, H. The Man of Sorrows in the arms of the Virgin [Electronic resource] / H. Memling // National Gallery of Victoria. – Mode of access: https://www.ngv.vic.gov.au/explore/collection/work/4179/. – Date of access: 08.12.2020.

10. Biskupski, R. Ikony w zbiorach polskich / R. Biskupski. – Warszawa : Wydaw. artystyczne i filmowe, 1991. – 44 s.: 151 il.

11. File: Wrocław Christ as Man of Sorrows.jpg [Electronic resource] // Wikimedia Commons. – Mode of access: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Wroc%C5%82aw_Christ_as_Man_of_Sorrows.jpg. – Date of access: 13.04.2021.

12. Maineri, A. Vita di Santa Caterina Fiesca Adorna da Genova succintamente descritta, e ricavata da'processi fatti per la di lei canonizzazione. Col Trattato del Purgatorio e dialogo tra l'anima ed il corpo composto dalla medesima santa / A. Maineri. – Roma : Nella stamperia del Bernabò, 1737. – 128 p.

13. Юсим, М. Екатерина Генуэзская / М. Юсим // Католическая энциклопедия : в 5 т. / редкол.: Г. Цёрох (председатель) [и др.]. – М., 2002. – Т. 1. – С. 1799.

14. Capes, F. M. Catherine of Genoa / F. M. Capes // The Catholic encyclopedia: an international work of reference on the constitution, doctrine, discipline, and history of the Catholic Church : [in 17 vol.] / Catholic Truth Comm. ; ed. Ch. G. Herbermann. – New York, 1913. – Vol. 3. – P. 446–447.

15. Scuola genovese sec. XVIII, Santa Caterina da Genova [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.beweb.chiesacattolica.it/heritage/work/1603221/Scuola+genovese+sec.+XVIII%2C+Santa+Caterina+da+Genova. – Date of access: 08.04.2021.

16. Perché visitare il Museo dei Beni Culturali dei Cappuccini [Electronic resource]. – Mode of access: https://wallinapp.com/walloutmagazine/perche-visitare-il-museo-dei-beni-culturali-dei-cappuccini/. – Date of access: 08.04.2021.

17. Gregori, C. Die heilige Katharina von Genua in Betrachtung des Kruzifixus [Electronic resource] / C. Gregori. – Mode of access: https://skd-online-collection.skd.museum/Details/Index/949112. – Date of access: 08.04.2021.

18. Gregori, C. Die heilige Katharina von Genua [Electronic resource] / C. Gregori. – Mode of access: https://skd-online-collection.skd.museum/Details/Index/931344. – Date of access: 08.04.2021.

19. Rizzoli, L. Medaglie antoniane in musei stranieri / L. Rizzoli // Il Santo. – 1931. – № 4. – P. 125–157.

20. Mašić, B. Religijske medaljice u Srednjovjekovnoj arheološkoj zbirci Muzeja grada Zagreba = Religiöse Medaillen in der Mittelalterlichen archäologischen Sammlung des Museums der Stadt Zagreb / B. Mašić. – Zagreb : Muzej grada Zagreba, 2014. – 103 S.

21. Forrest, B. An introduction to religious medals / B. Forrest. – Dallas : Numismatics Intern., 2004. – 211 p.

22. Varona, F. La medalla de Devoción en Europa entre los siglos XVI y XIX / F. Varona. – Madrid : [s. n.], 2008. – 707 p.

23. Sigüenza Martín, R. Joyas devocionales: san Juan Nepomuceno como ejemplo / R. Sigüenza Martín // II Congreso Europeo de Joyería : vestir las joyas, modas y modelos, Madrid, 20–21 de noviembre de 2013 a. / Museo del Traje, Centro de Investigación del Patrimonio Etnológico. – Madrid, 2015. – P. 138–153.

24. Calvario / Arma Cristi S. XVIII (S.XVIII-O235) [Electronic resource] // Cruces y Medallas. – Mode of access: https://www.cruces-medallas.com/t9247-calvario-arma-cristi-s-xviii-s-xviii-o235. – Date of access: 08.04.2021.

25. Jesús y la Verónica / Atributos de la Pasión de Cristo – MR502 (R. M. SXVIII-O319) [Electronic resource] // Cruces y Medallas. – Mode of access: https://www.cruces-medallas.com/t11134-jesus-y-la-veronica-atributos-de-la-pasion-de-cristo-mr502-r-m-sxviii-o319. – Date of access: 08.04.2021.

26. Atributos de la Pasion o Arma Christi / Aparicion v.del Pilar (R. M. SXVIII-O28) (mam) [Electronic resource] // Cruces y Medallas. – Mode of access: https://www.cruces-medallas.com/t657-atributos-de-la-pasion-o-arma-christi-aparicion-v-del-pilar-r-m-sxviii-o28mam. – Date of access: 08.04.2021.

27. Museo Francescano, Roma. Il campionario di medaglie devozionali della bottega Hamerani : catalogo / Ministero per i Beni e le Attività Culturali e per il Turismo ; red.: S. Pennestrì, Fr. Yohannes Teklemariam Bache. – Roma : Istituto Poligrafico e Zecca dello Stato Italiano, 2019. – Vol. 2. – 426 p. – (Notiziario del Portale Numismatico ; no. 13.2).

28. Gallamini, P. La medaglia devozionale cristiana: Secoli XVII–XVIII–XIX (parte II, secolo XVIII) / P. Gallamini // Medaglia. – 1990. – № 25. – P. 60–124.

References

1. Shirinskij S. S. Report on the excavation of three burial mounds near the village of Glybov, Rechitsa district, Gomel region in 1958. *Central Scientific Archives of the National Academy of Sciences of Belarus.* Fund. Inventory 1. Arch. № 153a. (in Belarusian).

2. Shirinskii S. S. Mounds of the XI–XII centuries. near the vill. Glybov. *Kratkie soobshcheniya o dokladakh i polevykh issledovaniyakh Instituta arkheologii. Vyp. 104. Srednevekovye pamyatniki Vostochnoi Evropy* [Brief reports on reports and field research of the Institute of Archeology.104. Medieval monuments of Eastern Europe]. Moscow, 1965, pp. 121–123 (in Russian).

3. *New Testament of our Lord Jesus Christ.* Minsk, Medial Publ., 542 p. (in Belarusian).

4. Sventsitskaya I. S., Skogorev A. P. (comp.). *Apocryphal legends about Jesus, the holy family and witnesses of Christ*. Moscow, Cogelet Publ., 1999. 175 p. (in Russian).

5. Yablokov K. Veronica. *Catholic encyclopedia. Vol. 1.* Moscow, 2002, pp. 941–942 (in Russian).

6. Sacharov P. "Anima Christi". *Catholic encyclopedia. Vol. 5.* Moscow, 2013, pp. 662–663 (in Russian).

7. Frisbee S. H. Anima Christi. *The Catholic encyclopedia: an international work of reference on the constitution, doctrine, discipline, and history of the Catholic Church.* New York, 1913, vol. 1, p. 515.

8. Flikop-Svita G. *Icon-painting heritage of Belarus of the 17th – early 20th centuries: Artifacts from the collection of the National Historical Museum of the Republic of Belarus.* Minsk, Knigazbor Publ., 2019. 84 p. (in Belarusian).

9. Memling H. The Man of Sorrows in the arms of the Virgin. *National Gallery of Victoria.* Available at: https://www.ngv.vic.gov.au/explore/collection/work/4179/ (accessed 08.12.2020).

10. Biskupski R. *Ikony w zbiorach polskich* [Icons in Polish collections]. Warszawa, Wydawnictwo artystyczne i filmowe, 1991. 44 p.: 151 il. (in Polish).

11. File: Wrocław Christ as Man of Sorrows.jpg. *Wikimedia Commons. Available* at: https://commons.wikimedia.org/wiki/File:Wroc%C5%82aw_Christ_as_Man_of_Sorrows.jpg (accessed 13.04.2021).

12. Maineri A. *Vita di Santa Caterina Fiesca Adorna da Genova succintamente descritta, e ricavata da'processi fatti per la di lei canonizzazione. Col Trattato del Purgatorio e dialogo tra l'anima ed il corpo composto dalla medesima santa* [Life of Saint Catherine Fiesca Adorned of Genoa: succinctly described, and drawn from the processes made for her Canonization: With the Treatise on Purgatory, and Dialogue between the Soul, and the Body: Composed by the same saint]. Roma, Nella stamperia del Bernabò, 1737. 128 p. (in Italian).

13. Yusim M. Catherine of Genoa. *The Catholic encyclopedia. Vol. 1.* Moscow, Franciscan Publ., 2002, p. 1799 (in Russian).

14. Capes F. M. Catherine of Genoa. *The Catholic encyclopedia: an international work of reference on the constitution, doctrine, discipline, and history of the Catholic Church.* New York, 1913, vol. 3, pp. 446–447.

15. *Genoese school sec. XVIII, Saint Catherine of Genoa.* Available at: https://www.beweb.chiesacattolica.it/heritage/work/1603221/Scuola+genovese+sec.+XVIII%2C+Santa+Caterina+da+Genova (accessed 08.04.2021) (in Italian).

16. *Why visit the Capuchin Museum of Cultural Heritage.* Available at: https://wallinapp.com/walloutmagazine/perche-visitare-il-museo-dei-beni-culturali-dei-cappuccini/ (accessed 08.04.2021) (in Italian).

17. Gregori C. *Saint Catherine of Genoa contemplating the crucifix*. Available at: https://skd-online-collection.skd.museum/Details/Index/949112 (accessed 8 April 2021) (in German).

18. Gregori C. *Saint Catherine of Genoa*. Available at: https://skd-online-collection.skd.museum/Details/Index/931344 (accessed 08.04.2021) (in German).

19. Rizzoli L. *Medaglie antoniane in musei stranieri* [Antonian medals in foreign museums]. *Il Santo* [The Saint], 1931, no. 4, pp. 125–157 (in Italian).

20. Mašić B. *Religijske medaljice u Srednjovjekovnoj arheološkoj zbirci Muzeja grada Zagreba* [Religious medals in the Medieval Archaeological Collection of the Museum of the City of Zagreb]. Zagreb, Zagreb City Museum, 2014. 103 p. (in Croatian).

21. Forrest B. *An introduction to religious medals.* Dallas, Numismatics International, 2004. 211 p.

22. Varona F. *La medalla de Devoción en Europa entre los siglos XVI y XIX* [The Devotion medal in Europe between the 16th and 19th centuries]. Madrid, 2008. 707 p. (in Spanish).

23. Sigüenza Martín R. *Joyas devocionales: san Juan Nepomuceno como ejemplo* [Devotional Jewels: Saint John of Nepomuk as an example]. *II Congreso Europeo de Joyería : vestir las joyas, modas y modelos, Madrid, 20–21 de noviembre de 2013 a.* [II European Congress of Jewelery: dressing the jewels, fashions and models, Madrid, 20–21 November 2013]. Madrid, 2015, pp. 138–153 (in Spanish).

24. *Calvary / Arma Christi S. XVIII (S.XVIII-O235).* Available at: https://www.cruces-medallas.com/t9247-calvario-arma-cristi-s-xviii-s-xviii-o235 (accessed 08.04. 2021) (in Spainish).

25. *Jesus and Veronica / Attributes of the Passion of Christ – MR502 (R. M. SXVIII-O319).* Available at: https://www.cruces-medallas.com/t11134-jesus-y-la-veronica-atributos-de-la-pasion-de-cristo-mr502-r-m-sxviii-o319 (accessed 08.04.2021) (in Spainish).

26. *Attributes of the Passion or Arma Christi / Appearance v.del Pilar (R. M. SXVIII-O28) (mam).* Available at: https://www.cruces-medallas.com/t657-atributos-de-la-pasion-o-arma-christi-aparicion-v-del-pilar-r-m-sxviii-o28mam (accessed 08.04.2021) (in Spainish).

27. *Museo Francescano, Roma. Il campionario di medaglie devozionali della bottega Hamerani: catalogo. Vol. 2. Notiziario del Portale Numismatico; no. 13.2* [Franciscan Museum, Rome. The collection of devotional medals from the

Hamerani workshop. Vol. 2. Numismatic Portal Newsletter, no. 13.2]. Rome, Polygraphic Institute and Mint of the Italian State, 2019. 426 p. (in Italian).

28. Gallamini P. *La medaglia devozionale cristiana: Secoli XVII–XVIII–XIX (parte II, secolo XVIII)* [The Christian devotional medal: 17th–18th–19th centuries (part II, 18th century)]. *Medaglia* [Medal], 1990, no. 25, pp. 60–124 (in Italian).

Информация об авторе

Кунаш Александр Олегович – научный сотрудник. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: kunash_aliaksandr@outlook.com

Information about the author

Aliaksandr A. Kunash – Scientific Researcher. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: kunash_aliaksandr@outlook.com